

Фота: Nathalie Samoilov / wikipedia.org

# Надзея Хадасевіч-Лежэ

**Славутая мастачка Надзея Хадасевіч (Nadia (Khodossievitch) Léger) нарадзілася ў вёсцы Асецішчы, цяпер – Докшыцкі раён Віцебскай вобласці ў 1902 годзе.**

Бацькі паходзяць з колішняга Барысаўскага павету Мінскай губерні (цяпер Барысаўскі раён Мінскай вобласці Беларусі): Пётр Хадасевіч нарадзіўся ў вёсцы Мужанка, а маці Марыя – у мястэчку Зембін. Адпаведна, Надзея была беларускага паходжання і першыя 14 гадоў жыцця пражыла ў беларускай сялянскай сям’і ў вёсцы.

У 1917-м, падчас Першай сусветнай вайны, сям’я эвакуявалася ў Бялёў Тульскай губерні (Расія), адкуль Надзея ў веку 15 гадоў самавольна з’ехала ў Смаленск, дзе паступіла ў Дзяржаўныя вышэйшыя мастацкія майстэрні. Там яна вучылася ў земляка, нарадзінца Мінску Уладзіслава Страмінскага (Władysław Strzemiński), які ачольваў тамтэйшую групу УНОВІС (“Утвердители нового искусства”) у Смаленску.

У 1921 годзе з’язджае ў Варшаву, скарыстаўшыся правам уцекачоў з Заходняй Беларусі вярнуцца ў свае сялібы і дамы, што адышлі да Польшчы. З 1922-га займалася ў Акадэміі мастацтваў і вывучала варшаўскія музейныя зборы. У 1927- м, пасля нараджэння дачкі Ванды, разам з мужам Станіславам Грабоўскім выехала ў Парыж, дзе паступіла ў тамтэйшую Акадэмію сучаснага мастацтва, якой кіравалі Азанфан і Лежэ, які і стаўся чарговым мужам Надзеі (афіцыйна – у 1952-м).

У 1930-я гады Надзея Хадасевіч-Лежэ наладзіла выданне часопісу “Сучаснае мастацтва” (“L'Art Contemporain – Sztuka Współczesna”), што выходзіў адначасова на дзвюх мовах – французскай і польскай.

У гады Другой сусветнай вайны Надзея ўступіла ў Таварыства дапамогі фронту. Падчас акупацыі Францыі працавала ў падполлі, распаўсюджвала ў

Парыжы ўлёткі партызанаў. У 1944 годзе ўступіла ў Саюз савецкіх патрыётаў і ў Саюз дапамогі былым ваеннапалонным; зладзіла выставу – аўкцыён мастакоў, удзельнікаў Рэзістансу, на карысць Чырвонага Крыжа і Саюзу савецкіх патрыётаў. Надзея Хадасевіч-Лежэ ў 1968 годзе ўпершыню наведала СССР, пабывала ў родных мясцінах свайго дзяцінства, у Беларусі.

Прыязджала ў Беларусь некалькі разоў да сваіх родных. Надзея падаравала савецкім музеям некалькі жывапісных працаў мужа і свае палотны ды 72 мазаічныя партрэты. Таксама яна падаравала беларускім школам больш за 2000 якасных рэпрадукцыяў карцінаў Люўру, што склалі спачатку вялікую перасоўную выставу, якую ў пачатку 1970-х гадоў вазілі па гарадах і вёсках Беларусі.

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і ў Зембінскай карціннай галерэі Музею народнай славы зберагаюцца мазаікі, творы жывапісу і графікі Надзеі. Выставы, што праходзілі ў Беларусі пры ейным удзеле, і падарункі мастацкіх твораў ды рэпрадукцыяў прыкметна паўплывалі на мастацкае жыццё Беларусі 1970-х гадоў.

Першая кніга ўспамінаў Надзеі Хадасевіч-Лежэ ў рэдакцыі Любові Дубенскай выйшла ў Маскве ў 1978 годзе. Паводле яе ды іншых сведчанняў савецкіх і польскіх (Караліна Зыховіч, галерэя “Zachęta”) даследнікаў, Надзея Хадасевіч паслядоўна ідэнтыфікавала сябе як беларуску, мела выразную нацыянальную беларускую свядомасць.

Унёсак творцы ў гісторыю мастацтва Расеі вельмі сціплы, абмежаваны двума гадамі ейнага навучання ў Смаленску (дзе ў 1919-м была першая сталіца створанай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі). Больш часу яна вучылася ў Польшчы, дзе атрымала прафесійную мастацкую адукацыю ў Варшаўскай акадэміі мастацтваў. А з 1924-га і да сваёй смерці ў 1982-м жыла і займалася творчасцю ў Францыі, дзе і сфармавалася як творца ды выпрацавала ўласны мастацкі стыль.

**Такім чынам, лагічна і карэктна называць яе французскаю мастачкаю беларускага паходжання, чыя творчасць і грамадская дзейнасць паўплывала на фармаванне мастацкай культуры Беларусі, а таксама, ускосна, Польшчы міжваеннага перыяду.**